# ХРЫСЦІЯНСКІЯ СВЯТОЧНЫЯ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСІ Ў МІНУЛЫМ І СУЧАСНАСЦІ



**Аляксандра Гурко (Верашчагіна),**
заг. аддзела нарадазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар гістарычных навук

Асновы беларускіх хрысціянскіх традыцый, якія сталі адным з найважнейшых элементаў сучаснага жыцця грамадства, былі закладзены яшчэ ў Сярэднявеччы. У сучаснай поліканфесіянальнай структуры Беларусі, дзе каля 60% насельніцтва з'яўляецца веруючым, хрысціянства займае дамінуючыя пазіцыі. Першае месца па колькасці вернікаў і абшчын – у праваслаўнай царквы, затым ідуць каталіцкая і розныя накірункі пратэстанцтва. Рэлігія і рэлігійны вопыт (святы, святочныя традыцыі, абрады), як і раней, застаюцца важнай часткай жыцця большасці насельніцтва нашай краіны, аб чым сведчыць насычанае царкоўнае жыццё беларускіх вернікаў, урачыстае адзначэнне святочных дзён царкоўнага календара, у якіх прымае ўдзел значная колькасць веруючых.

Чаму святочныя дні прывабныя для вернікаў і шмат у чым вызначальныя для атрымання рэлігійнага вопыта? У сваім першапачатковым сэнсе да іх адносілі тыя дні, падчас якіх спыняецца звычайная працоўная (будзённая) дзейнасць чалавека і грамадства і адбываецца ўшанаванне сакральнага (Бога). З цягам часу прыходзіць афармленне ў выглядзе святочных дзён і падзей сакральнай ці мірской гісторыі, важных для пэўнай асобы, сям'і, сацыяльнай групы ці дзяржаўнага ўтварэння.

Святы выконваюць некалькі асноўных функцый: сакральную (зносінаў са свяшчэнным); міфалагічную (узнаўлення першасных часоў і дзействаў першапродкаў і герояў міфа); культурна-інтэграцыйную (аб'яднання ўсіх членаў грамадства падчас выканання святочных дзействаў дзеля перадачы сакральных ведаў і забеспячэння стабільнасці ў грамадстве); функцыю псіхічнай адаптацыі чалавека да ўнутранага і знешняга асяроддзя, а таксама выхавання этнічнай самасвядомасці.

У культуры грамадства святы займаюць вельмі важнае месца, бо не толькі звязаны з перыядамі працоўнай дзейнасці і зменай гадавых цыклаў, але і адзначаюць значныя падзеі ў розныя гістарычныя перыяды. Як неад'емная частка культуры хрысціянскія святы нярэдка атаясамліваюцца і нават зліваюцца з этнічнымі традыцыямі і таму выступаюць адным са значных элементаў, якія фарміруюць і складаюць этнічную самасвядомасць.

Вядомы даследчык у вобласці параўнальнага рэлігіязнаўства Мірча Эліядзэ ў XX ст. даказаў, што міфалагічна-рытуальны святочны цырыманіял з'яўляецца адзіным як для архаічных, так і для традыцыйных грамадстваў. Яго элементы вар'іруюць у залежнасці ад пэўнай этнічнай традыцыі, але сутнасць застаецца аднолькавай [12].

У прыватнасці, ва ўсіх хрысціянскіх традыцыях у той ці іншай ступені можна адзначыць наступныя элементы.

- У велікодных літургіях абавязкова ўзнаўляюцца падзеі з Быцця – старажытназапаветных апавяданняў аб існаванні першалюдзей у райскім садзе, грэхападзенні і далейшай біблейскай гісторыі чалавецтва.
- Усім вялікім хрысціянскім святам папярэднічае пост – строгія абмежаванні і забароны на спажыванне пэўных страў, а таксама забарона на ўдзел у грамадскіх гульнях і забавах, сэксуальных адносінах.
- Падчас посту чалавек павінен «ачысціцца» ад грахоў, спавядацца і прычасціцца.
- Распачынаецца вялікае хрысціянскае свята літургіяй, пасля якой адбываецца зняцце забарон, якія былі прыняты падчас паста.
- Да вялікіх свят звычайна прымеркаваны дні памінання памерлых продкаў.
- Вялікая роля надаецца велікоднаму і калядному агню, які запальваецца ў храмах. Велікодны агонь, атрыманы ў храме Гроба Гасподняга ў Іерусаліме, урачыста перадаецца ў розныя праваслаўныя і іншыя хрысціянскія храмы.
- Падчас калядных дзён захоўваюцца рэшткі язычніцкіх мантычных практык, якія не інтэграваны ў хрысціянскія традыцыі, але трывала існуюць побач з імі.

Сучасныя хрысціянскія святы ўвабралі двухтысячагадовы рэлігійны вопыт. У іх аснове ёсць элементы блізкаўсходняй, паўночнаафрыканскай, антычнай традыцый; далей – вопыт старажытназапаветнай святочнай традыцыі ў сукупнасці з набыткамі першахрысціянскай царквы; потым – слаі розных адгалінаванняў хрысціянства – праваслаўя, каталіцтва, пратэстанцтва, якія ўзніклі ў працэсе развіцця хрысціянскай традыцыі ў розныя стагоддзі. Структура святочнага календара кожнай хрысціянскай канфесіі, якія існуюць у сучаснай Беларусі, мае пэўныя адрозненні, але ў аснове – адзіная.

Хрысціянскія святы інтэгравалі папярэднюю духоўную спадчыну беларускіх земляў, прыняўшы цыклы змены сезонаў года, веснавога і восеньскага раўнадзенства, летняга і зімовага сонцастаяння, якія раней з'яўляліся вызначальнымі для язычніцтва. У хрысціянскім календары адпаведна гэтым астранамічным датам прымеркаваны Ражство і Вялікдзень, Ражство Іаана Прадцечы і Ражаство Божай Маці.

На ўсходнеславянскія землі хрысціянства прыйшло ўжо з цэльнай, сфарміраванай каляндарнай сістэмай, якая суадносілася з прынятымі дагматамі і распрацаванай абраднасцю. Паступова, на працягу тысячагоддзя, адбывалася своеасаблівая эвалюцыя ўсходнеславянскага хрысціянскага календара, які ўвабраў у сябе рысы язычніцтва ў выглядзе рэштkаў папярэдніх вераванняў і абрадаў. Напрыклад, генезіс беларускага праваслаўнага календара быў распачаты з двух крыніц: першая – гэта Візантыя, адкуль быў пераняты каляндар асноўных двунадзесятых свят, звод святых і дзён, ім прысвечаных, асноўная хрысціянская дагматыка, сімволіка і абраднасць. Другая крыніца – гэта каляндар язычніцкіх маленняў, які адлічваў пачатак і канец сельскагаспадарчай дзейнасці ў залежнасці ад фаз паспявання хлеба, сонца, перыяда дажджоў.

З цягам часу светапогляд грамадства непазбежна змяняецца пад уплывам унутраных і знешніх фактараў.


Служэнні на Ражаство ў Царкве Хрысціян Веры Евангельскай "Благадаць". Мінск, 2014.


Каталіцкае Ражаство 2020 г. у Магілёве


Асвячэнне велікоднай трапезы ў Св.-Мікольскім манастыры ў Магілёве. 2022 г.

Пры высвятленні былой сістэмы светапогляду новая звычайна інтэгруе найбольш устойлівыя элементы свят і рытуалаў папярэдняй і змяшчае іх у сваім рэлігійным цыкле. На беларускіх землях спачатку на змену язычніцтву прыйшло хрысціянства, якое ўвабрала ў сябе мноства элементаў дахрысціянскіх культаў. У часы існавання Вялікага княства Літоўскага праваслаўе ў XVI–XVIII стст. было выцеснена каталіцтвам (усходняга і заходняга абраду), і быў уведзены новы каляндарны адлік часу – грыгарыянскі каляндар, распаўсюджаны на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. У XIX ст. пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі зноў быў прыняты для карыстання юліянскі каляндар, а аднаўленае праваслаўе захавала мноства элементаў каталіцкай і уніяцкай абраднасці. Трансфармацыі беларускай хрысціянскай святочнай традыцыі ў XX ст. былі звязаны спачатку са складанымі ўмовамі існавання ў дзяржаве з атэістычнай ідэалагічнай сістэмай, а ў канцы XX ст. – з аднаўленнем традыцыйнай канфесійнай структуры пры падтрымцы ўлады незалежнай беларускай дзяржавы. Кожны з гэтых этапаў суправаджаўся істотнымі зменамі не толькі ў царкоўнай арганізацыі, але і ў святочным календары.

Старажытная хрысціянская традыцыя выкарыстоўвала юліянскі каляндар, уведзены Юліем Цэзарам у 45 г. да Ражства Хрыстова, і менавіта ён узяты за аснову праваслаўнай царквой. Заходняя хрысціянская традыцыя з 1582 г. карыстаецца грыгарыянскім календаром. Увогуле, 1 студзеня стала лічыцца ў грамадзянскім календары пачаткам года ў большасці краін Заходняй Еўропы з XVI ст., а ў Расіі – з 1700 г. Да гэтага часу пачаткам года служылі ў асобных краінах ці Вялікдзень, ці Благавешчанне, ці Ражаство [4]. Размежаванне паміж грыгарыянскім і юліянскім календарамі звязана са святкаваннем Вялікадня, якое не павінна супадаць з іудзейскім Пэсахам, згодна з рашэннем Першага Нікейскага сабору 325 г.

Спроба прымусіць праваслаўную царкву перайсці на новы каляндарны адлік часу адносіцца да савецкага перыяду. Амаль адразу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, 16 (29) лістапада 1917 г., СНК прыняў рашэнне, а пазней і дэкрэт «Аб увядзенні ў Расійскай рэспубліцы заходнееўрапейскага календара». Дэкрэт прадпісваў пасля 31.01.1918 г. (юліянскі каляндар) лічыць не 1 лютага, а 14 лютага (грыгарыянскі каляндар). Але праваслаўная царква, як і раней, працягвала жыць па юліянскім календары.

Хрысціянскае свята складаецца з такіх элементаў, як святочны час, святочны настрой, святочныя адносіны, святочныя рэальна-ідэальныя ці ўмоўныя паводзіны, святочнае адзенне і інтэр’ер, святочныя стравы і інш. Сэнс хрысціянскага свята заключаецца не толькі ў даніне памяці і благагавейнай павагі да вялікіх падзей мінулага, але і ў напаміне аб тым, што «Свяшчэнная Гісторыя не скончылася, яна працягваецца і ў нашым жыцці, і кожны (з вернікаў)… з’яўляецца яе ўдзельнікам, яе персанажам» [7].

Пры класіфікацыі хрысціянскіх свят вылучаюць тры групы па іх значнасці – вялікія, сярэднія і малыя. Найбольш вялікае свята – Вялікдзень (Пасха), далей – двунадзесятыя – у гонар Хрыста і Божай Маці. Дадаецца класіфікацыя хрысціянскіх свят па зместу – у гонар Хрыста, Багародзіцы і святых; па часу – рухомыя (у залежнасці ад Вялікадня) і нерухомыя. Далучаюцца прастольныя святы, існуюць святы ў гонар цудатворных абразоў Божай Маці. Форма правядзення праваслаўных, каталіцкіх і уніяцкіх свят амаль нязменная і аднолькавая – гэта ўрачыстае богаслужэнне, прысвечанае пэўнай падзеі ці асобе. Трэба адзначыць, што на вялікія святы абавязкова праводзіцца ўсяночная, у адрозненне ад іншых груп свят.

У праваслаўнай традыцыі самыя ўрачыстыя богаслужэнні (усяночныя) павінны адбывацца на Вялікдзень, вялікія Гасподнія і Багародзічныя святы, Ражство Прадцечы, святых апосталаў Пятра і Паўла і некаторыя іншыя. Вылучаецца асобная група, да якой адносіцца царкоўнае навалецце і святы ў гонар выратавання ад бедаў і войнаў [6].

Рымска-каталіцкай традыцыі ўласцівы тры найгалоўнейшыя святы – Божага Нараджэння, Вялікадня і Заслання Духа Святога, да якіх далучаюцца і іншыя, прысвечаныя галоўным рымска-каталіцкім дагматам, падзеям царкоўнай гісторыі і памяці святых, у тым ліку і беларускіх [5].

У пратэстантаў Беларусі (евангельскіх хрысціян-баптыстаў, пяцідзесятнікаў) большую частку календару складаюць святы, якія ўшаноўваюцца ўсімі хрысціянамі, «святы, якія апісваюцца ў Свяшчэнным Пісанні». Гэта Нараджэнне Хрыстова, Хрышчэнне Гасподняе, Грамніцы, Уваход Госпада Ісуса Хрыста ў Іерусалім, або Вербная Нядзеля, Звеставанне, Страсны Чацвер, Вялікдзень, Ушэсце, Тройца, Пераўтварэнне Госпадняе. Існуюць і ўласна пратэстанцкія святы, як Дзень Жніва. У пратэстанцкіх цэрквах Беларусі аснову святочнага богаслужэння складаюць пропаведзі, якія ўпрыгожаны яркімі эпітэтамі і прыкладамі з жыцця, мноствам цытат з Біблii, агульнацаркоўнымі і харавымі спевамі, малітвамі.

У атэістычны перыяд у большасці насельніцтва Беларусі захоўваліся элементы хрысціянскай абраднасці. Адзначаліся Вялікдзень, Ражаство Хрыстова і іншыя святы. Веруючымі выконваліся самыя неабходныя рытуальныя дзействы – вымаўленне малітваў, царкоўныя спевы, трыманне пастоў. Людзі, па звычаю, ухіляліся ад працы ў святочныя дні, займаліся прыгатаваннем абрадавых страў (печыва, афарбоўка яек і г.д.), уладкаваннем святочнага стала і запрашэннем гасцей – сваякоў і знаёмых.

Архіўныя дадзеныя красамоўна сведчаць аб тым, што нават у часы ганенняў на вернікаў у цэрквах і касцёлах на вялікія святы збіралася вялікая колькасць прыхаджан, выконваліся рэлігійныя абрады. Так, напрыклад, у 1940-х гг. на традыцыйнае свята Жыровіцкай Божай Маці 20 мая штогод збіралася каля 15 тыс. праваслаўных вернікаў і да 100 святароў. На прастольнае свята на Тройцу 5 чэрвеня 1949 г. ў касцёле в. Рось Ваўкавыскага раёна сабралася каля 10 тыс. католікаў. Рэлігійныя вераванні былі распаўсюджаныя не толькі сярод прадстаўнікоў старэйшага пакалення. Так, сярод наведвальнікаў храмаў заўсёды было ад 25 да 50% моладзі [3].

У Рэспубліцы Беларусь на працягу 30 год адбываецца працэс узнаўлення рэлігійнага жыцця вернікаў, які адбіўся і на рэканструкцыі свят. Аднавілася традыцыя святкавання старадаўніх свят, усталяваліся новыя, шануюцца новыя святыя. Павялічылася колькасць паломніцтваў да святых месцаў і ікон. Адбываецца працэс беларусізацыі царкоўнага жыцця, які аказаў значны ўплыў на фарміраванне нацыянальных асаблівасцей хрысціянскай святочнай традыцыі (з'яўленне адметных рысаў у святочнай абраднасці, ушанаванне беларускіх святых і абразоў, прастольных свят і дат, прысвечаных падзеям беларускай царкоўнай гісторыі, пераклад тэкстаў Свяшчэннага Пісання на беларускую мову).

Як і ў мінулыя стагоддзі, у Беларусі паўсюдна і ўрачыста адзначаюцца вялікія святы хрысціянскага календара – Вялікдзень і Ражаство Хрыстова, якія атрымалі статус дзяржаўных (1991), Дзень Маці (Пакрава, 1996), а таксама Радуніца (1998) і інш. Галоўныя хрысціянскія святы, згодна з дзяржаўнымі пастановамі, сталі днямі адпачынку на Беларусі. Да іх у сучаснасці


Святкаванне Вялікадня ў Свята- Духавым саборы Мінска. 2022 г.


Велікоднае богаслужэнне Беларускай Праваслаўнай Царквы ў 2022 г. у Мінску

прымеркаваны апублікаваныя ў сродках масавай інфармацыі пасланні іерархаў хрысціянскіх цэркваў з апісаннем зместа святочных падзей і віншаваннямі вернікаў, а таксама прамыя трансляцыі па тэлебачанні святочных набажэнстваў з храмаў Беларусі, а таксама з Масквы, Рыма і Іерусаліма. Абавязковымі элементамі сталі святочныя прывітанні і наведванні храмаў кіраўніком дзяржавы.

Працягваюць урачыста адзначацца галоўныя святы праваслаўнага царкоўнага календара. Так, у ноч на 24 красавіка 2022 г., у свята Светлага Хрыстова Уваскрэшання, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, узначаліў хрэсны ход, святочную Велікодную ютраню і Боскую літургію свяціцеля Іаана Залатавуста ў Свята-Духавым кафедральным саборы Мінска. Перад пачаткам хроснага ходу Мітрапаліт перадаў Жыватворны агонь вернікам. Велікодную ютраню і Літургію ў прамым эфіры трансліраваў тэлеканал Беларусь 1. Такія ж святочныя мерапрыемствы адбываюцца ў Мінску і рэгіёнах краіны на свята Ражаства Хрыстова.



Велікодныя ўпрыгожванні ў гандлёвым цэнтры Дана Мол. Мінск, 2022 г.

Аднаўляюцца старыя калядныя традыцыі. Напрыклад, 11 студзеня 2020 г. адбыўся паказ тэатралізаванай пастаноўкі «Калядная гісторыя», падрыхтаваны царквой Ушэсця Гасподняга сумесна з устаноwай культуры а/г Гарадзец [8].

У каталіцкім календары напачатку XXI ст. па-ранейшаму таксама займаюць найгалоўнейшае месца святы Раства Ісуса Хрыста і Вялікадня. Цэнтрам каталіцкіх калядных урачыстасцей у Беларусі ў 2020 г. стаў Магілёў. Святочную імшу ў Касцёле Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі і святога Станіслава ўзначаліў біскуп Аляксандр Яшэўскі [9]. Магілёўскай гарадской капэлай пад кіраўніцтвам С. Лішчанкі была выканана «Урачыстая імша» Людвіга ван Бетховена [10].

У календары пратэстантаў адным з найбольш ушанаваных святаў па-ранейшаму застаюцца Ражаство Хрыстова і Вялікдзень, да якіх звычайна прымеркаваны не толькі ўрачыстыя малітоўныя сходы, але і тэатралізаваныя паказы, дабрачынныя акцыі. Так, 25 снежня 2014 г. ў царкве ХВЕ «Благадаць» горада Мінска адбылося ўрачыстае богаслужэнне. Святочная праграма складалася са спеваў хора, выступлення інструментальнага аркестра, удзелу ў тэатралізаваным прадстаўленні моладзі, дзяцей – вучняў нядзельнай школы [11].

Трэба адзначыць, што ў 2020 г. падчас пандэміі кіраўнікі хрысціянскіх цэркваў у вялікія святы – Вялікдзень і Ражаство Хрыстова – звярнуліся да вернікаў з заклікам па магчымасці выконваць усе святочныя рытуалы дома. І ўсё ж галоўныя хрысціянскія святы падчас гэтых складаных двух гадоў пандэміі былі адзначаны вернікамі Беларусі.

Святы ўспрымаюць сучаснае свецкае абрамленне – падчас іх праводзяцца ўрачыстыя пасяджэнні і канцэрты, навуковыя канферэнцыі, тэмай якіх з'яўляюцца вядомыя дзеячы і знакамітыя даты царкоўнай гісторыі; гулянні па-за сценамі храмаў, асабліва ў буйных гарадах. І традыцыйна да святочнага цыкла (асабліва велікоднага і каляднага) у беларускіх гарадах праходзяць кірмашы, на якіх прадстаўлены прадукты і вырабы з усіх куткоў Беларусі.

Трансфармацыя святочных абрадаў асабліва прыкметная ва ўмовах вялікіх гарадоў. Так, напрыклад, навагоднія традыцыі беларусаў у сучаснасці ўключаюць элементы калядных каталіцкіх і праваслаўных святочных цыклаў, якія адзначаюцца на дзяржаўным узроўні. Гэта знаходзіць адлюстраванне ў святочных богаслужэннях, вадохрышчанскіх купаннях, калядных кірмашах, а таксама ўключэнні дахрысціянскіх па паходжанні абрадавых элементаў – калядавання, варажбы, ваджэння казы, батлейкі.

Тое ж тычыцца і велікодных святкаванняў. Велікоднымі сімваламі (яйка, трус, зялёныя кветкі, рознакаляровыя стужкі і інш.) упрыгожваюць гандлёвыя цэнтры, магазіны, царкоўныя двары і гарадскія пляцы. Новай




Упрыгожванні на Вялікдзень на вуліцах г. Жодзіна. 2022 г.

з'явай царкоўнага жыцця сталі балы праваслаўнай моладзі, якія праходзяць з 2008 г.

Аб захаванні старажытнага разумення свята і святочных абрадаў сярод насельніцтва Беларусі сведчаць дадзеныя апытанняў, праведзеных у пачатку 2010-х гг. сярод студэнтаў [1]. Рэспандэнты з Віцебскай воласці адзначалі: «Слова «свята» мы разумеем як дзень, у які нельга працаваць: у святочныя дні мы не выконваем складанай працы, акрамя паўсядзённай (напрыклад, кармлення хатняй скаціны)». Сустракаюцца адказы накont таго, што акрамя Вялікадня на іншыя святы (Успенне Багародзіцы, Праабражэнне, Ушэсце, Пакроў Прасвятой Багародзіцы і інш.) «святочнасць абмяжоўваецца адсутнасцю працы» (г. Маладзечна). «Мама забараняе мне што-небудзь рабіць, як гэта заўсёды рабіла бабуля,– расказвае студэнтка БУКа з Мінска.– Гэтая забарона тычыцца не толькі вялікіх святаў, але і звычайнай нядзелі». Студэнт БДУ, грэка-католік з Мінска, паведаміў, што «па святах, па магчымасці, у яго сям'і пазбягаюць рабіць пэўную працу, прыбіраць дамы, мыцца і да таму падобнае».

Па дадзеных апытанняў, хрысціянская святочная традыцыя займае настолькі важнае месца ў жыцці сучаснага беларускага грамадства, што нават тая частка рэспандэнтаў, якая засведчыла свае атэістычныя погляды, адзначае найбольш вялікія хрысціянскія святы, са святочным хатнім застоллем, рытуальнымі стравамі, але без наведвання ўрачыстага богаслужэння: «Святы хрысціянскія ў нашай сям'і не адзначаюцца, бо бацька і я (студэнт БУКа, г. Мінск) з'яўляемся атэістамі і зусім гэтым не цікавімся… Выключэннем з'яўляецца толькі каштаванне (на Вялікдзень) асвячоных яек і кулічоў, якія нам прыносіць бабуля».

Адбываецца ўзаемапранікненне і перапляценне рысаў каталіцкай і праваслаўнай абраднасці, што падцвярджае значная колькасць адказаў наконт святкавання абодвух Вялікадней і нават Ражаства Хрыстова па грыгарыянскім і юліянскім календары.

Такім чынам, асноўная перадача хрысціянскай традыцыі ў сучаснасці адбываецца ў большасці апытаных падчас свят царкоўнага календара праз удзел у святочных богаслужэннях, у якіх узнаўляюцца самыя галоўныя для хрысціян біблейскія падзеі. Носьбітамі традыцыі з'яўляецца не толькі святарства, але (менавіта з савецкіх часоў) і старэйшае пакаленне.

Тое, што аб'ядноўвае ўсе хрысціянскія канфесіі ў краіне ў наш час – гэта абрады, святы і таінствы, якія, адрозніваючыся ў кананічнай трактоўцы кожнай канфесіі, за тысячагадовы перыяд існавання на беларускай зямлі сталі часткай яе гісторыі і культуры, набылі асаблівасці, звязаныя з традыцыямі нашага народа. У сучасным паліканфесійным беларускім грамадстве важнае значэнне мае павага да святочных традыцый для захавання міру і згоды ў дзяржаве. Напрыклад, важным фактарам, які павінен быў знішчыць міжканфесійныя супярэчнасці, стала прызнанне дзяржаўнымі як праваслаўных, так і каталіцкіх свят на дзяржаўным узроўні.


**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**

1. Архив Института искусствоведения, этнографии фольклора им. К. Крапивы НАН Беларуси. Фонд 6.– Оп.13.– Д. 3.
2. Архимандрит Киприан (Керн). Литургика. Гимнография и эортология.– М., 2000.
3. Государственный архив Гродненской области. Фонд 1385.– Оп. 1.– Д. 14.
4. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы. Зимние праздники.– М., 1973.
5. Кунцлер Михаэль. Литургия Церкви. Кн. 1 / Пер. с нем. Е. Верещагина.– М., 2001.
6. Настольная книга священнослужителя Русской Православной Церкви.– М., 2001.
7. А. Петровых. Рождество Христово // Теократия. 2002. №1 (1). С. 6–9.
8. Рождество Христово на приходе церкви аг. Городец // https://pravbrest.by/archives/7580.
9. Табагари М. Католики празднуют Рождество Христово // https://mogilevnews.by/news/25–12–2020–12–21/68685.
10. «Торжественная месса» Людвига ван Бетховена будет исполнена в Могилеве на католическое Рождество // https://mogilevnews.by/news/21–12–2020–17–35/68581.
11. Церковь «Благодать» // http://www.cxbe.by/news/tserkov_blagodat?id=2735.
12. Элиаде М. Священные тексты народов мира / М. Элиаде / пер. с англ. В. Федорина.– М., 1998.